У ЦЭНТРЫ УВАП

# УЛАДА + НАВУКА + ВЫТВОРЧАСЦЬ = ВЫНІК

**Пазаўчора ў Наваполацку ўдзельнікі пленарнага пасяджэння навукова-кансультацыйнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу абмяркоўвалі, як развіваецца першы ў Беларусі іванавацыйна-прамысловы нафтахімічны кластар. Гэты «кангламерат» быў створаны ў 2017 годзе. Адпаведнае пагадненне аб супрацоўніцтве тады падпісалі кіраўнікі гарвыканкама, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і адкрытага акцыянернага таварыства «Нафтан».**



Кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента Наталля Качанава, якая ўзначальвае гэты савет, выказала ўпэўненасць, што пры правільным падыходзе кластар можа быць вельмі карысны для ўсіх, хто ў яго ўваходзіць або зацікаўлены стаць яго членам, а таксама для развіцця рэгіёна і краіны ў цэлым.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што кластар адначасова павінен спрыяць вырашэнню многіх задач. Напрыклад, павелічэнню вырабу прадукцыі з высокім дабаўленым коштам, унутранага валавога прадукту, павышэнню якасці навучання студэнтаў, навуковага патэнцыялу, у тым ліку прыцягненню моладзі ў навуку.

На сённяшні дзень кластар налічвае сем удзельнікаў. Плануецца, што ў хуткім часе да іх далучацца яшчэ тры. Як падкрэсліў старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, намеснікстаршыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, такая форма ўзаемадзеяння мае перспектывы, што пацвярджаецца і вялікім інтарэсам да супрацоўніцтва з боку адной з самых буйных кітайскіх карпарацый. Мэр горада дадаў, што кластар дазваляе прыцягнуць больш інвестараў для развіцця горада ў цэлым, новыя тэхналогіі — для павышэння эфектыўнасці кіравання эканомікай...



Дарэчы, у Наваполацку сёлета пачаліся заняткі ў двух спецыялізаваных класах, дзе юнакоў і дзяўчатбудуць мэтанакіравана рыхтаваць да паступлення ва ўстановы адукацыі, звязаныя з перапрацоўкай нафты. Гэты вопыт Наталля Качанава ўхваліла. Як і планы больш плённага супрацоўніцтва нашых навукоўцаў з прамысловікамі. Каб мінімізаваць выплаты замежнікам, якія робяць праекты, будуюць устаноўкі для нафтаперапрацоўчай галіны, робяць экспертызы якасці прадукцыі і гэтак

У мясцовай альма-матар штогод рыхтуюць кадры для нафтаперапрацоўчай прамысловасці краіны і актыўна супрацоўнічаюць з «Нафтанам». Але і тут ёсць яшчэ вялікі рэзерв. На мерапрыемстве рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктартэхнічных навук, прафесар Дзмітрый ЛАЗОЎСКІ агучыў магчымыя кірункі больш плённага ўзаемадзеяння з «Нафтанам». Напрыклад, гэта датычыцца да экспертных паслуг, Прадстаўнікі вышэйшай навучальнай установы цікава расказалі пра вопыт работы

Качанаву асабліва закранула гаворка аб тым, што многія выкладчыкі і навукоўцы сыходзяць з ВНУ на прадпрыемствы з-за значнай розніцы ў аплаце працы. Сапраўды, гэта тэма для асобнага абмеркавання. Напрыклад, чаму б у такім выпадку былому выкладчыку, які стаў работнікам «Нафтана», не чытаць лекцыі студэнтам і надалей — пры фінансавай падтрымцы прадпрыемства? Навучэнцы хутка ааануць членамі каманды «нафтанаўцаў», таму лагічна «ўкладвацца» ў веды патэнцыйных калег...

Дыскусія была надзвычай цікавая і вельмі шчырая — пасяджэнне скончылася на гадзіну пазней, чым планавалася.

Спікер Савета Рэспублікі прапанавала часцей збірацца менавіта ў такім фармаце, бо ёсць шмат дробных невідавочных пытанняў, але менавіта з-за іх нешта і бывае «на ручніку» або развіваецца не так хутка, як хацелася б. Наталля Качанава не раз падкрэслівала, што ў дэфіцыце - ініцыятыва. А тое, што ў краіне ёсць: ад структур, дзе працуюць эксперты, распрацоўшчыкі, даследчыкі, да розных камітэтаў і ведамстваў — павінна працаваць па максімуме. Тут ёсць магчымасць без прыцягнення знешніх інтэлектуальных сіл, фірмаўвытворцаў, гэта значыць, самастойна спрыяць эфектыўнаму вырабу тавараў і паслуг.

Каментуючы вынікі пасяджэння журналістам, Наталля Качанава адзначыла, штоабмеркаванне карыснае для тага, каб скаардынаваць практыкудзейнасці іншых кластараў. Іху Беларусі ўжо сем — напрыклад, у Віцебскай вобласці ёсць фармацэўтычны. Такая форма арганізацыі вытворчасці за мяжой даказала сваю эфектыўнасць, Беларусь жа не адстае ад часу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Л\г\тл* КопТА